CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

KOD | PESEL

***Miejsce na naklejkę.***
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **E-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# EGZAMIN MATURALNY
# JĘZYK BIAŁORUSKI – POZIOM PODSTAWOWY

## TEST DIAGNOSTYCZNY

TERMIN: **marzec 2021 r.**
CZAS PRACY: **170 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY**

Uprawnienia zdającego do:

☐ dostosowania zasad oceniania.

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 12 stron (zadania 1–11). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
5. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
8. Możesz korzystać ze słowników językowych.

EMBB-P0-**100**-2103

Układ graficzny
© CKE 2021

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 1.–6.**

Наталля Салодкая
***Маўленчая экалогія грамадства***

Аднойчы мудрацы вырашылі правесці эксперымент. Яны былі ўпэўненыя, што дзеці, не чуючы гаворкі асяроддзя, змогуць навучыцца роднай мове. Пасадзілі немаўлят розных нацыянальнасцей у асобныя пакоі, іх абслугоўвалі выключна нямыя людзі, і, калі прыйшоў час падводзіць вынікі, мудрацы былі здзіўленыя, бо дзеці рыкалі, мяўкалі, выдавалі самыя разнастайныя гукі, але толькі не мову. І яны прыйшлі да высновы, што чалавеку мова сама па сабе не адкрываецца, і ён у сваю чаргу ўбірае ў сябе ўсё ад свайго асяроддзя.

Экалогія азначае падтрыманне раўнавагі. І як існуе экалогія навакольнага свету, так павінна існаваць і экалогія грамадства. […] Слова ўплывае на чалавека, фарміруе яго думкі, асобу. […] Чалавек пазіцыяніруе сябе па слове. Нездарма ж продкі казалі: “Або гавары, як апрануты, або апраніся, як гаворыш”. […]

Зараз зносіны паміж людзьмі адбываюцца не толькі з вока на вока, але і ў сеціве. Аднак там сітуацыя не тое што не лепшая, а, як мне здаецца, нават горшая. Бо людзі зусім не думаюць пра тое, што пішуць, што іх словы могуць закрануць іншых. Існуе нават “мова варожасці”. Гэта камунікацыя, якая не нясе ніякага сэнсу, акрамя выражэння нянавісці, стварэння гвалту. Яна грунтуецца на стэрэатыпах, прадузятасці, дыскрымінацыі і накіравана на сімвалічнае знішчэнне “іншасці”, “не такіх”.

Так атрымалася, што большасць з нас жыве ў бясконцай інфарматыўнай плыні. З кожным днём навін робіцца ўсё больш, чытаць іх становіцца ўсё складаней, аднак ці шмат сярод гэтай інфармацыі роднай мовы? Мне здаецца, што беларуская мова зараз нагадвае куфар, напоўнены скарбамі, але на вечку якога мы сядзім, не адкрываючы яго. І замест гэтага карыстаемся смеццем, раскіданым побач. […]

І адной з прычын гэтага з’яўляецца абыякавае стаўленне да Слова, якое моцна ўплывае на асобу і якім трэба ўмець карыстацца.

Паводле Н. Салодкай, *Маўленчая экалогія грамадства*, www.websmi.by

**Заданне 1. (0–1)**
**На аснове ўсяго тэксту Наталлі Салодкай растлумач сэнс загалоўка *Маўленчая экалогія грамадства*.**

.............................................................................................................................
.............................................................................................................................
.............................................................................................................................
.............................................................................................................................
.............................................................................................................................
.............................................................................................................................

**Заданне 2. (0–2)**

**Ацані праўдзівасць прыведзеных ніжэй сказаў згодна з тэкстам. Праўдзівыя сказы пазнач літарай П, непраўдзівыя – Н.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Аўтар тэксту прааналізаваў маўленчыя здольнасці дзяцей. | **П** | **Н** |
| **2.** | Аўтар тэксту прадставіў залежнасць развіцця маўлення ад асяроддзя. | **П** | **Н** |
| **3.** | Аўтар тэксту сцвярджае, што словы ўздзейнічаюць на чалавека. | **П** | **Н** |
| **4.** | Аўтар тэксту сцвярджае, што фарміраванне асобы адбываецца незалежна ад маўлення. | **П** | **Н** |

**Заданне 3. (0–1)**

**Прачытай прыведзеныя ніжэй сказы. Выпішы адно слова, ужытае ў пераносным значэнні і растлумач яго сэнс у кантэксце прыведзенага выказвання.**

*Мне здаецца, што беларуская мова зараз нагадвае куфар, напоўнены скарбамі, але на вечку якога мы сядзім, не адкрываючы яго. І замест гэтага карыстаемся смеццем, раскіданым побач.*

..................................................................................................................................

..................................................................................................................................

**Заданне 4. (0–1)**

**Што з’яўляецца асноўнай тэмай разважанняў аўтара ў тэксце *Маўленчая экалогія грамадства*? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**А.** Актуальныя экалагічныя праблемы.

**Б.** Уплыў навакольнага асяроддзя на сучаснага чалавека.

**В.** Сучасныя навуковыя эксперыменты.

**Г.** Маўленчая камунікацыя ў сучасным грамадстве.

**Д.** Канкурэнцыя на спажывецкім рынку.

**Заданне 5. (0–1)**

**Да кожнага з прыведзеных ніжэй слоў падбяры антонім.**

зараз – ......................................................................................................................

лепш – ......................................................................................................................

позна – ......................................................................................................................

**Заданне 6. (0–1)**

**Да кожнага слова сярод 1–3 выберы і дапасуй адпаведнае значэнне сярод А–Г.**

| | |
|---|---|
| **1.** грамадства | **А.** Узаемныя адносіны, дзелавая, сяброўская сувязь. |
| **2.** зносіны | **Б.** Спакой, нармальны стан духоўнага і маральнага жыцця. |
| **3.** правілы | **В.** Сукупнасць людзей, аб'яднаных пэўнымі адносінамі, якія абумоўлены спосабам вытворчасці матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. |
| | **Г.** Пастанова, палажэнне, якія абавязваюць захоўваць пэўны парадак пры выкананні чаго-небудзь. |

**1.** ........................... **2.** .......................... **3.** ..........................

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 7.–10.**

Хрысціна Чарняўская

***Збегчы з гораду і разлічваць на сябе***

Працяглы час Даша Яскевіч працавала ў псіха-неўралагічным доме-інтэрнаце, дзе займалася рэабілітацыяй, адаптацыяй і псіхалагічнай дапамогай людзям з асаблівасцямі. [...] Але вясной гэтага году дзяўчына вырашыла звольніцца і пераехаць жыць на вёску.

Мара жыць у вёсцы, падалей ад мегаполіса, у дзяўчыны была даўно. Яна лічыць гарадское асяроддзе варожым і стрэсавым. Таму як толькі з'явілася магчымасць збегчы, вырашыла не адмаўляцца. Ды і вёска знаходзіцца ўсяго ў дзвюх гадзінах ад сталіцы, што, па словах Дашы, не такая вялікая адлегласць пры наяўнасці аўтамабіля і добра развітай транспартнай сеткі.

Суіснаваць з прыродай у Дашы атрымалася ад самага пачатку. Праўда, першы час крыху бянтэжыла[1], калі раніцай у госці да падворку прыходзілі казулі і крычалі. Чуць іх так блізка было нязвыкла. Аднак дзяўчына тлумачыць гэта тым, што „ўсе мы людзі культурнага асяроддзя".

Зараз жа не здзіўляюць ні вожыкі, ні казуркі. З некаторымі нават удалося пабудаваць сяброўскія адносіны. Так, на кухні ў доме жывуць вялікія мурашы, „яны не нахабнічаюць і мы паводзім сябе без прэтэнзій". [...]

„З агародам пакуль вайна, бо дзеля гэтага трэба ўзрасціць у сабе ўнутраную бабулю, з адпаведным падыходам да ўсяго жывога. А гэта праца і з гэтым цяжэй. Да ўсяго трэба ведаць розныя тэхналогіі, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення. Трэба ведаць, калі палоць, бо тыдзень раней, тыдзень пазней – эфект не той. Я падглядаю за суседзямі, яны пайшлі – і ты туп-туп-туп", – смяецца Даша.

На вёсцы Даша жыве не адна. Побач чорны сабака, два каты, трусік і варона. [...]

„Я – гарадскі жыхар, але дзяцінства пражыла ў прыватным доме з пячным ацяпленнем. Таму ў такой форме жыццё для мяне не новае і не выклікае дыскамфорту. Падняцца раніцай пратапіць печ, глядзець за гаспадаркай... Можа, канешне, і будзе ўраган і ў цябе знясе дах. Але любому чалавеку трэба быць гатовым да ўсяго", – разважае яна.

Паводле Х. Чарняўскай, *Збегчы з гораду і разлічваць на сябе*, greenbelarus.info

[1] Бянтэжыць – непакоіць.

**Заданне 7. (0–2)**

**З прапанаваных сцверджанняў выберы тыя, якія ілюструюць прадстаўлены ў тэксце тэзіс „усе мы людзі культурнага асяроддзя”. Пазнач ТАК, калі сцвярджэнне падыходзіць, або НЕ, калі не падыходзіць.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Крык казулі можа збянтэжыць непрызвычаенага чалавека. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Чалавеку лёгка пабудаваць сяброўскія адносіны з жывёламі. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Большасць людзей марыць пра жыццё ў вёсцы. | **ТАК** | **НЕ** |
| **4.** | Гарадскі чалавек не мае вопыту блізкага суіснавання з дзікай прыродай. | **ТАК** | **НЕ** |

**Заданне 8. (0–1)**

**Перафразуй прыведзены ніжэй сказ так, каб перадаць яго сэнс без ужывання метафары.**

З агародам пакуль вайна.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 9. (0–2)**

**Акрэслі стыль тэксту *Збегчы з гораду і разлічваць на сябе* і падай адну характэрную рысу гэтага стылю.**

Стыль: ..........................................................................................................................

Характэрная рыса: ………..........................................................................................

……………………………………………………………………………………………

**Заданне 10. (0–1)**

**Закончы сказ. Выберы і пазнач правільны працяг сярод варыянтаў А–В і яго абгрунтаванне сярод 1–3.**

Працяглы час Даша Яскевіч працавала ў псіха-неўралагічным доме-інтэрнаце, дзе займалася рэабілітацыяй, адаптацыяй і псіхалагічнай дапамогай людзям з асаблівасцямі.

Падкрэсленае слова з’яўляецца

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **А.** | архаізмам, | таму што | **1.** | замяняе непажаданае слова. |
| **Б.** | неалагізмам, | | **2.** | з’яўляецца запазычаным словам. |
| **В.** | эўфемізмам, | | **3.** | замяняе ўстарэлае слова. |

**Заданне 11. (0–37)**

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie**

**Тэма 1. Што азначае паступаць па-людску? Паразважай над пытаннем на падставе фрагмента апавядання Кузьмы Чорнага *Макаркавых Волька*, цэлага твора і выбранага тэксту культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Кузьма Чорны
***Макаркавых Волька***

„Вось цяпер і вядома, куды пасылаць заяву, – падумаў Дзядзюля. – Раённым органам”.

У тыя самыя дні Волька пісала сваёй сяброўцы:

„...Тысячы момантаў з майго маленства паўсталі перада мной як жывыя. Я пазнавала дрэвы, каменні, узгоркі... Я прывяла да парадку магілы бацькоў і доўга хадзіла па родных дарогах. Тут усё так блізка і знаёма майму сэрцу. Я шаную тое, што было ў маёй душы з маленства і люблю сучаснае. Тут мне будзе весела і радасна працаваць. Сярод тых людзей, якіх я ведала заўсёды, і тым цікавей мне цяпер бачыць іх у сапраўдным чалавечым жыцці...

Не абышлося і без непрыемных успамінаў. Я дазналася, праз каго я тады гэтулькі перацярпела знявагі і крыўды. Але гэты прыкры эпізод увесь у мінулым: не перашкодзіў жа ён мне скончыць інстытут. Я гэтага чалавека лячыла. Як мне было агідна дакранацца да яго рукамі. Я хацела толькі аднаго: каб ён хутчэй паправіўся і каб больш не лячыць мне яго. Прыйшоўшы дадому, я доўга мыла рукі і думала: зусім можа быць, што ён зноў пачне займацца падобным шальмоўствам. Нашто? Так сабе, з ласкі на пацеху... Адным словам – чорт з ім...

Пасля сапраўднага асенняга дажджу зноў стаіць яснае надвор’е і яшчэ цвітуць познія кветкі...”

К. Чорны, *Макаркавых Волька*, knihi.com

**Тэма 2. Зрабі аналіз верша. Пастаў інтэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Янка Купала

***Беларус***

Сеў, як той крыж на расстаі,
Сярод пушч і поля,
Злажыў рукі і чакае
Усё нейкай долі.

Устане ж, пойдзе полем, логам,
Будзе дыхту, будзе:
Пачапаў тупым нарогам
Кургановы грудзі.

Лом з крыжоў магільных звале,
Бульбу падпякае...
Пад'еў, сеў, як крыж, і далей
Долі ўсё чакае.

А ці ж прыйдзе доля гэта,–
Трудна адгадаці,
Пакуль толькі з лета ў лета
Пляце яму лапці.

1910 г.

Я. Купала, *Беларус*, knihi.com

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................................

..........................................................................................................................................................................

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| rozprawka | A. | 0 – 3 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 6 – 9 – 12 | | |
| interpretacja | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 1 – 2 | | |
| | D. | 0 – 2 – 4 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 1 – 3 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

## **BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***